Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка”

УДК 947.6 “1861/1914”

Башмакоў
Аляксей Аляксеевіч

# МАНУФАКТУРНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ І ЯЕ РОЛЯ Ў САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСІ. 1861—1914 гг.

Аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2009

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

**Навуковы кіраўнік –** **Люты Анатолій Міхайлавіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

**Афіцыйныя апаненты:** **Касцюк Міхаіл Паўлавіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі XX – XXI ст. дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

**Цяплова Валянціна Анатольеўна,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу Беларускага дзяржаўнага універсітэта

**Апаніруючая арганізацыя –** установа адукацыі "Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт"

Абарона адбудзецца 23 кастрычніка 2009 г. у 14 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02.21.03 пры ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд. 482, тэл. 200-82-53, e-mail: bagdanovich.sovet@tut.by

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка".

Аўтарэферат разасланы 21 верасня 2009 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый І. І. Багдановіч

# УВОДЗІНЫ

Даследаванне мануфактурнай вытворчасці і яе ролі ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі мае вялікае значэнне для гістарычнай навукі, бо набліжае да вырашэння глабальнай праблемы вызначэння ўзроўню развіцця капіталістычных адносін у краі ў 1861–1914 гг.

Відавочна, што ў гістарыяграфіі сфарміраваліся два супрацьлеглыя пункты гледжання адносна праблемы развіцця капіталізму ў Беларусі. Так, адны гісторыкі перабольшвалі тэмпы развіцця капіталізму з мэтай даказаць наяўнасць сацыяльна-эканамічных перадумоў сацыялістычнай рэвалюцыі. Іншыя, наадварот, указвалі на нізкія тэмпы развіцця сацыяльна-эканамічных адносін, параўноўваючы беларускія губерні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі.

Каб ацаніць узровень развіцця капіталізму ў Беларусі, неабходна прааналізаваць мясцовую прамысловасць, што з'яўляецца выдатным індыкатарам сталасці сацыяльна-эканамічных працэсаў.

Даволі невялікі прамежак часу, што ўключае ў сябе гады ад 1861 і да 1914, уяўляе выключную цікавасць з-за істотных сацыяльна-эканамічных змен, якія былі выкліканы крызісам феадальнай фальваркава-паншчыннай сістэмы і штуршком для якіх стала рэформа 1861 г.

З 1861 г. пачынаецца новы перыяд у развіцці прамысловасці, і калі да буржуазных рэформаў у Беларусі панавала рамесная і дробнатаварная вытворчасць, то ў канцы XIX ст. відавочнай стала тэндэнцыя стварэння новых мануфактур і заводаў. Зразумела, што ў такіх абставінах значна павялічваецца ўплыў мануфактурнай вытворчасці на сацыяльна-эканамічнае жыццё грамадства.

Тым не менш працэсы развіцця капіталізму маюць свае рэгіянальныя асаблівасці. У адносінах да Беларусі гэта даволі позні час правядзення рэформаў, іх маруднае ажыццяўленне, наяўнасць шматлікіх феадальных перажыткаў, дыскрымінацыйная рэгіянальная палітыка царскага ўрада і нявырашанае яўрэйскае пытанне, што прадвызначыла становішча рэгіёна ў другой палове XIX ст.

Амаль усе даследчыкі, якія займаліся аналізам прамысловасці ці яе тыпаў, абмяжоўваліся вызначэннем асноўных характарыстык прамысловасці (галіновай структурай, геаграфічным размеркаваннем прадпрыемстваў, сумай вытворчасці, колькасцю рабочых і інш.), аднак не звярталі дастатковай увагі на той уплыў, што мелі мануфактурны, фабрычна-заводскі, дробнатаварны і рамесны тыпы вытворчасці на іншыя сферы жыцця краю, у прыватнасці, на іх ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці.

У гістарыяграфічных працах мануфактурная вытворчасць разглядалася як заканамерны этап развіцця прамысловасці, а таму ўспрымалася безумоўна станоўча. Тым не менш мануфактурная вытворчасць у парэформенны перыяд аказвала не толькі станоўчы ўплыў на развіццё Беларусі (палепшыла паказчыкі прамысловасці, стымулявала павышэнне прадукцыйнасці мясцовых сельскагаспадарчых вытворцаў, садзейнічала развіццю таварна-грашовых адносін і гандлю, павелічэнню спажывання і грузазвароту, часткова кампенсавала нізкі ўзровень развіцця фабрычна-заводскай вытворчасці, паўплывала на фарміраванне і развіццё рынку вольнанаёмнай працы, станаўленне гарадоў як прамысловых і эканамічных цэнтраў, фарміраванне пралетарыяту і прамысловай буржуазіі), але і адмоўны, што праявіўся ў замаруджванні развіцця тэхнічна больш дасканалай фабрычна-заводскай вытворчасці і наогул тэхнічнага прагрэсу.

Такім чынам, навізна даследавання заключаецца ў аналізе не толькі самой мануфактурнай вытворчасці, але і яе ролі ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі. Акрамя таго, даследаванне ўпершыню вызначае не толькі станоўчыя, але і адмоўныя аспекты гэтага ўплыву на развіццё капіталізму.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

## Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі

Даследаванне мае сувязь з навуковай тэмай: “Сацыяльна-эканамічнае развіццё, грамадска-палітычнае і культурнае жыццё Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.” (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20064425), што распрацоўваецца ва ўстанове адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”. Тэма дысертацыі зацверджана Саветам БДПУ (пратакол № 4 ад 26.01.2006 г.).

## Мэта і задачы даследавання

Мэта даследавання – вызначыць ролю і месца мануфактурнай вытворчасці ў сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі ў 1861–1914 гг.

Для дасягнення мэты даследавання прадугледжана вырашэнне наступных задач:

1. прааналізаваць гістарыяграфічныя працы па вывучаемай праблеме, вызначыць ступень яе распрацаванасці, ацаніць методыкі папярэдніх даследаванняў праблемы, вызначыць іх перавагі і недахопы;
2. вызначыць уплыў (станоўчы ці адмоўны), што аказалі на развіццё мануфактурнай вытворчасці наступныя фактары: палітыка самадзяржаўя ў Беларусі, сельская гаспадарка, прамысловасць, будоўля чыгуначнай сеткі,



фінансава-банкаўская сістэма, узмацненне ролі гарадоў, змены ў колькасным складзе насельніцтва;
3. прасачыць змены колькасці мануфактурных прадпрыемстваў, разгледзець іх галіновую структуру і колькасць занятых на іх рабочых, суму вытворчасці і сярэднюю прадукцыйнасць працы на прадпрыемствах, а таксама вызначыць іх геаграфічную лакалізацыю ў межах тэрыторыі Беларусі ў прааналізаваны перыяд;
4. параўнаць мануфактурную вытворчасць з прадпрыемствамі іншых тыпаў, у першую чаргу фабрычна-заводскага, па вызначаных вышэй характарыстыках;
5. ацаніць уплыў мануфактурнай вытворчасці на сацыяльна-эканамічнае развіццё і капіталізацыю эканомікі краю, разгледзець сацыяльны статус гаспадароў мануфактур у даследуемы перыяд.

**Аб’ектам даследавання** дысертацыйнай працы з’яўляецца прамысловасць Беларусі ў 1861–1914 гг.

**Прадметам даследавання** з’яўляецца капіталістычная мануфактура і яе роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

## Палажэнні, якія выносяцца на абарону

1. Абмежаваны характар рэформаў 60-х гг., палітыка замацоўвання буйнога рускага землеўладання ў беларускіх губернях, а таксама дадатковыя падаткі і забарона куплі-продажу зямлі для памешчыкаў каталіцкага веравызнання адмоўна паўплывалі як на палітычную, так і на сацыяльна-эканамічную сферы жыцця грамадства, захоўваючы феадальныя перажыткі, стрымліваючы капіталістычныя пераўтварэнні ў жыцці грамадства.

Створаная расійскім самадзяржаўем “мяжа яўрэйскай аселасці”, забарона на пасяленне ў сельскай мясцовасці і набыццё зямлі яўрэямі выклікала штучнае перанасяленне гарадоў і мястэчак. Адсутнасць тут значных магчымасцяў для працаўладкавання прывяла да з’яўлення надзвычай вялікай колькасці рамесных майстэрань, дзе і працавала яўрэйская бедната. Рамеснікі канкурыравалі з буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі, у тым ліку і мануфактурнага тыпу, пастаўляючы на рынак танную прадукцыю больш нізкай якасці. Невысокі ўзровень развіцця буйной прамысловасці абмяжоўваў прыток беларускіх беззямельных сялян у гарадскую прамысловасць.

Невысокі ўзровень прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі і павелічэнне колькасці насельніцтва амаль што ў тры разы ў даследуемы перыяд не дазвалялі забяспечыць перапрацоўчую прамысловасць таннай сельскагаспадарчай

сыравінай, што стрымлівала яе развіццё. Залежнасць ад урадлівасці глебы і надвор'я абумовіла нетрывалы характар працы мануфактурных прадпрыемстваў, што спецыялізаваліся на перапрацоўцы прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Будаўніцтва чыгунак і паляпшэнне шляхоў зносін станоўча паўплывалі на пашырэнне знешняга і ўнутранага гандлю, адкрывалі перад беларускай буйной прамысловасцю раней недасягальныя рынкі збыту і сыравіны. Гэта палепшыла становішча беларускай мануфактурнай вытворчасці.

Позняе развіццё фінансава-банкаўскай сістэмы ў Беларусі характарызавалася арыентацыяй саслоўных банкаў на падтрымку сельскай гаспадаркі. Крэдытаваннем прамысловасці займаліся камерцыйныя банкі, што прапаноўвалі значна горшыя ўмовы выдачы крэдытаў. Дробныя вытворцы ўвогуле не мелі доступу да крэдытных рэсурсаў.

На працягу даследуемага перыяду гарады і асобныя мястэчкі набылі функцыі гандлёва-эканамічных, банкаўскіх і транспартных вузлоў. Акрамя таго, пераважная большасць гарадоў з'яўлялася адміністратыўнымі цэнтрамі губерняў і паветаў. Спалучэнне гэтых функцый рабіла гарады і буйныя мястэчкі зручнымі цэнтрамі для адкрыцця прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку і мануфактурнага тыпу.

Рост колькасці насельніцтва выклікаў павелічэнне прапановы рабочай сілы, што дазваляла мануфактуры як тыпу вытворчасці, заснаванаму на выкарыстанні ручной працы, паспяхова канкурыраваць з фабрыкамі і заводамі. Тым не менш, той жа фактар выклікаў рост колькасці рамесных майстэрань, што складалі канкурэнцыю буйной прамысловасці.

2. У другой палове XIX – пачатку XX ст. назіраўся працэс далейшага паступовага развіцця буйной прамысловасці. У першыя парэформенныя дзесяцігоддзі колькасць мануфактур заставалася невялікай, але пачынаючы з 80-х гг. XIX ст. назіраецца хуткі рост колькасці прадпрыемстваў, аб'ёму вытворчасці і колькасці мануфактурных рабочых. У пачатку XX ст. гэта тэндэнцыя таксама захоўвалася. Змяненне галіновай структуры мануфактурнай вытворчасці было выклікана як павышэннем канкурэнцыі з боку расійскіх і польскіх вытворцаў, так і развіццём шляхоў зносін і сельскай гаспадаркі.

Па колькасці прадпрыемстваў і рабочых у пачатку даследуемага перыяду пераважалі менавіта сельскія мануфактуры, але пачынаючы з канца XIX ст. перавага была ўжо на баку гарадскіх.

3. Вынікам навукова-тэхнічнага прагрэсу і капіталізацыі гаспадаркі Беларусі стала развіццё буйной прамысловасці і паляпшэнне яе тэхнічнай аснашчанасці: павелічэнне колькасці паравых машын і катлоў. Аднак да канца даследуемага перыяду характар прамысловасці краю кардынальна не змяніўся: па колькасці вытворчых адзінак і рабочых пераважалі рамесныя майстэрні і



дробнатаварныя прадпрыемствы, па суме вытворчасці буйная прамысловасць зраўняла паказчыкі толькі ў пачатку XX ст. Аднак прадпрыемствы буйной прамысловасці (мануфактуры, фабрыкі і заводы), а таксама асобныя дробнатаварныя прадпрыемствы, што мелі паравыя рухавікі ці катлы, дэманстравалі больш высокую прадукцыйнасць працы.

Мануфактурная вытворчасць параўнальна з фабрычна-заводскай да канца XIX ст. дэманстравала лепшыя паказчыкі па колькасці прадпрыемстваў і рабочых, прайграючы толькі па суме вытворчасці, тым не менш ужо ў пачатку XX ст. фабрычна-заводская вытворчасць мела перавагу па ўсіх асноўных паказчыках.

4. Дамінуючым сектарам эканомікі ў 1861–1914 гг. заставалася сельская гаспадарка. Але ў той жа час шматразовы рост мануфактуры па ўсіх паказчыках абумовіў узмацненне ўплыву прамысловасці на сацыяльна-эканамічнае развіццё краю. Рост колькасці буйных прадпрыемстваў вызначыў развіццё капіталістычных адносін у эканоміцы Беларусі і пэўныя змены ў сацыяльнай структуры грамадства: з'яўленне прамысловага пралетарыяту і буржуазіі. У першыя парэформенныя дзесяцігоддзі значная частка мануфактур належала землеўладальнікам беларускага паходжання. У канцы XIX – пачатку XX ст. пераважная большасць мануфактур знаходзілася ва ўласнасці купцоў ды багатых мяшчан, працавалі ж на іх збяднелыя мяшчане і абеззямеленыя сяляне. Змены ў сацыяльным і нацыянальным складзе рабочых і гаспадароў прадпрыемстваў былі выкліканы мэтанакіраванай палітыкай царскага ўрада, што прадугледжвала канцэнтрацыю яўрэяў у гарадах і мястэчках Беларусі. Гэта прывяло да росту колькасці рабочых і гаспадароў мануфактурных прадпрыемстваў гэтай нацыянальнасці.

Мануфактурная вытворчасць аказвала станоўчы ўплыў на развіццё рынку вольнанаёмнай працы і працэс урбанізацыі Беларусі. Перапрацоўчыя мануфактуры стварылі попыт на прадукцыю сельскай гаспадаркі, стымулявалі развіццё таварна-грашовых адносін і гандлю. Мануфактурная вытворчасць кампенсавала сабой нізкі ўзровень развіцця буйной машыннай індустрыі і адначасова канкурыравала з прадпрыемствамі фабрычна-заводскага тыпу.

## Асабісты ўклад суіскальніка

Даследаванне з'яўляецца аўтарскай працай. Даследчыкам знойдзена, апрацавана, сістэматызавана і прааналізавана вялікая колькасць архіўных спраў, афіцыйных матэрыялаў, манаграфічнай літаратуры. Гэта дало магчымасць грунтоўна распрацаваць праблему развіцця мануфактурнай вытворчасці, знайсці фактары, што паўплывалі на яе развіццё, прасачыць ролю мануфактуры ў сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Адносна вялікая колькасць архіўных дакументаў уведзена ў

навуковы ўжытак упершыню, што дазволіла аўтару рознабакова падысці да вывучаемай праблемы, зрабіць аб’ектыўныя высновы наконт узроўню і характару сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў парэформенны перыяд.

### Апрабацыя вынікаў дысертацыі

Асноўныя тэзісы даследавання прэзентаваліся на дзвюх рэспубліканскіх навукова-тэарэтычных канферэнцыях – “Беларусь у эпоху рэвалюцыйных узрушэнняў: Да 100-годдзя выхаду ў свет газеты “Наша ніва” і “Актуальныя праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.): да 90-годдзя Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.”, на II міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі “Еўропа: актуальныя праблемы этнакультуры”, а таксама на пасяджэннях кафедры гісторыі Беларусі БДПУ. Вынікі дысертацыі выкарыстоўваюцца для распрацоўкі курсаў лекцый і спецсемінараў.

### Апублікаванасць вынікаў дысертацыі

Вынікі дысертацыі апублікаваны ў сямі артыкулах, у тым ліку ў чатырох рэцэнзуемых часопісах і трох зборніках матэрыялаў рэспубліканскіх і міжнародных навукова-тэарэтычных канферэнцый, агульным аб’ёмам 2,84 аўтарскага аркуша.

### Структура і аб’ём дысертацыі

Даследаванне складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі працы, чатырох раздзелаў, заключэння, а таксама бібліяграфічнага спісу і дадатку. Ва ўводзінах даецца абгрунтаванне актуальнасці тэмы даследавання. У агульнай характарыстыцы працы прыводзяцца мэта, задачы, аб’ект і прадмет даследавання, пералічаны палажэнні на абарону, а таксама асабісты ўклад суіскальніка, апрабацыя вынікаў дысертацыі і яе структура. Першая глава ўключае аналіз гістарыяграфіі і крыніц, а таксама агляд методык папярэдніх даследаванняў па аналагічнай тэматыцы. Акрамя таго, тут прыводзіцца апісанне метадаў правядзення ўласнага даследавання. У другой главе апісваюцца сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы развіцця мануфактурнай вытворчасці ў канцы XIX – пачатку XX ст. У трэцім раздзеле прадстаўлены разгорнуты аналіз мануфактурнай вытворчасці на аснове сабранага матэрыялу, у тым ліку архіўнага. У чацвёртай главе вызначаецца ўплыў мануфактуры на сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі. У заключэнні зроблены агляд вынікаў даследавання згодна пастаўленых задач. Дысертацыя завяршаецца бібліяграфічным спісам і табліцай-дадаткам.

Агульны аб’ём дысертацыі складае 214 старонак, у тым ліку бібліяграфічны спіс 20 старонак і дадатак 91 старонка.



## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва “Уводзінах” абгрунтавана актуальнасць даследавання мануфактурнай вытворчасці як састаўной часткі прамысловасці і яе роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці грамадства. Акрэслены даследуемы перыяд часу, што прыпадае на перыяд уздыму буйной прамысловасці, у тым ліку капіталістычнай мануфактуры.

У “Агульнай характарыстыцы працы” акрэсліваецца сувязь працы з навуковымі праграмамі і тэмамі, вызначаюцца яе мэты і задачы, аб’ект і прадмет даследавання; фармулюецца навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў, разглядаюцца асабісты ўклад суіскальніка, апрабацыя вынікаў дысертацыі, колькасць апублікаваных работ, структура і аб’ём дысертацыі.

У першай главе “Гістарыяграфія і крыніцы” разгледжаны стан вывучэння праблемы, крыніцазнаўчая база і метады ўласнага даследавання.

У главе змешчаны гістарыяграфічны агляд прац, звязаных з праблемай развіцця мануфактурнай вытворчасці. Храналагічна першымі даследчыкамі беларускай прамысловасці 1861–1914 гг., у тым ліку мануфактурнай, з’яўляюцца прадстаўнікі расійскай дарэвалюцыйнай навукі. Большасць з іх займалася вывучэннем прамысловасці ў межах Расійскай імперыі, а таму хоць і заўважала наяўнасць розных методык падліку прадпрыемстваў (А.В. Пагожаў[1]) і неаднастайнасць развіцця прамысловасці па губернях (М. Туган-Бараноўскі[2]), усё ж схілялася да пагаліноваага вывучэння агульнарасійскай прамысловасці, што не дазваляла ўлічваць рэгіянальныя асаблівасці (Дз.А. Ціміразеў[3]).

Навукоўцы, што прытрымліваліся рэгіянальнай методыкі даследавання, комплексна разглядалі геаграфічныя, кліматычныя, этнакультурныя, канфесіянальныя асаблівасці беларускіх губерняў, што не дазваляла засяродзіць увагу на вывучэнні прамысловасці (П.П. Сямёнаў[4]). Асабліва трэба адзначыць даследаванне, выкананае пад рэдакцыяй А.С. Дзембавіцкага[5], што змяшчае рознабаковую інфармацыю аб прамысловасці Магілёўскай губерні.

---

[1] Погожев, А.В. Учет численности и состава рабочих в России с 1892 по 1902 г. : материалы по статистике труда / А.А. Погожев. – СПб. : Тип. Имп. Акад. наук, 1906. – 224 с.

[2] Туган-Барановский, М.И. Русская фабрика в прошлом и настоящем / М.И. Туган-Барановский. – 3-е изд. – СПб. : Наша жизнь, 1907. – Т. 1 : Историческое развитие русской фабрики в XIX веке. – XII, 562 с.

[3] Тимирязев, Д.А. Статистический атлас главнейших отраслей фабрично-заводской промышленности Европейской России с поименным списком фабрик и заводов / Д.А. Тимирязев. – СПб. : Обществ. польза, 1873. – Вып. 3. – 29 с.

[4] Семенов, П.П. Белорусская область в ее современном экономическом состоянии / П.П. Семенов // Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье. – Репр. воспроизведение изд. 1882 г., 2-е изд. – Минск, 1994. – С. 473–490.

[5] Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях, с двумя картами губернии и 17 резанными на дереве гравюрами видов и типов : в 3 кн. / под ред. А.С. Дембовицкого. – Могилев на Днепре : Тип. Губерн. Правления, 1882–1884. – Кн. 3. – 1884. – 1002 с.

У савецкай гістарыяграфіі выявілася тэндэнцыя да перабольшвання сацыяльна-эканамічнай ролі буйной прамысловасці, у тым ліку і мануфактуры (М.В. Доўнар-Запольскі[6], Д.А. Дудкоў[7]).

Даволі часта колькасць фабрык і заводаў завышалася за кошт дробнатаварных прадпрыемстваў. Так, грунтоўнасцю вылучаецца даследаванне беларускага вучонага М.Ф. Болбаса[8], які падлічыў колькасць прадпрыемстваў як мануфактурнага, так і фабрычна-заводскага тыпаў. Тым не менш выклікае сумненне абгрунтаванне аўтарскай класіфікацыі, паводле якой прадпрыемства можа лічыцца фабрыкай, заводам або мануфактурай. Адсутнасць мінімальнай лічбы працуючых у азначэнні фабрычна-заводскай вытворчасці дазволіла М.Ф. Болбасу аднесці да фабрык і заводаў дробнатаварныя прадпрыемствы, што выкарыстоўвалі паравыя рухавікі ці хімічныя працэсы.

Вялікі па аб'ёме і вельмі каштоўны матэрыял быў сабраны З.Е. Абезгаўзам[9]. Аўтар схіляўся да аналізу дробнатаварнай вытворчасці, што панавала ў той час на тэрыторыі Беларусі. Даследчык прасачыў этапы развіцця парэформеннай прамысловасці і прыйшоў да высновы, што яе ўздым пачынаецца не адразу пасля правядзення рэформаў у 1860-я, а значна пазней – толькі ў 1880–1890-я гг.

Пункт гледжання З.Е. Абезгаўза на развіццё прамысловасці ў значнай частцы супадае з высновамі, якія рабілі іншыя беларускія даследчыкі, што працавалі над сумежнымі тэмамі, спрабуючы паказаць адпаведнасць развіцця Беларусі агульнарасійскім тэндэнцыям. Менавіта такога пункту гледжання на развіццё капіталізму прытрымліваліся А.Ф. Вішнеўскі[10], аналізуючы развіццё беларускіх гарадоў у перыяд крызісу феадалізму, У.П. Панюціч[11] падчас даследавання сялянскага руху і аграрнага пытання ў пачатку XX ст.

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі былі закрануты асобныя аспекты развіцця беларускай мануфактурнай вытворчасці. У сваіх даследаваннях З. В. Шыбека[12], А. П. Жытко[13], А. М. Люты[14],

[6] Довнар-Запольский, М.В. Народное хозяйство Белоруссии 1861–1914 гг. / М.В. Довнар-Запольский. – Минск : Госплан БССР, 1926. – 238 с.

[7] Дудкоў, Д.А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / Д.А. Дудкоў. – Менск : Партмассэктар, 1932. – 202 с.

[8] Болбас, М.Ф. Промышленность в Белоруссии, 1860–1900 / М.Ф. Болбас. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 312 с.

[9] Абезгаўз, З.Е. Развіццё капіталізму ў прамысловасці. Фарміраванне пралетарыяту / З.Е. Абезгауз // Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал.: І.М. Ігнаценка [і інш.]. – Мінск, 1972. – Т. 2. – С. 99–128.

[10] Вишневский, А.Ф. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в период кризиса феодализма (30–50 гг. XIX в.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А.Ф. Вишневский ; Мин. гос. пед. ин-т. – Минск, 1973. – 24 с.

[11] Панютич, В.П. Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси, 1861–1914 гг. / В.П. Панютич ; под ред. П.Т. Петрикова. – Минск : Навука і тэхніка, 1996. – 142 с.

[12] Шыбека, З.В. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.) / З.В. Шыбека. – Мінск : ЭўроФорум, 1997. – 320 с.

[13] Жытко, А.П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму, 1861–1914 гг. / А.П. Жытко. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2003. – 233 с.

[14] Люты, А.М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя / А.М. Люты. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2004. – 320 с.



Н.І. Палятаева[15], М.М. Забаўскі[16] і А.Ф. Рацько больш узважана падыходзяць да вырашэння праблем развіцця парэформеннай Беларусі. Разнастайныя падыходы, з аднаго боку, ствараюць падставы для паглыбленага аналізу, а з другога – вядуць да адступлення ад дамінуючай лініі, якой раней трэба было абавязкова прытрымлівацца.

Важнае месца займае праца Л.Э. Пракаповіч[17], якая здолела засяродзіць увагу на ключавых аспектах развіцця фабрычна-заводскай вытворчасці, а прааналізаваныя архіўныя матэрыялы і манаграфічная літаратура дазволілі ўзважана і аб'ектыўна ацаніць месца і ролю прамысловасці ў жыцці Беларусі XIX ст., што, згодна з падлікамі даследчыцы, была далёка не выключнай.

Заўважым, што да сённяшняга часу, акрамя прац, якія закранаюць асобныя аспекты развіцця мануфактуры, не было праведзена комплекснага даследавання мануфактурнай вытворчасці Беларусі ў 1861–1914 гг.

Для вырашэння пастаўленых аўтарам задач спатрэбілася правесці археаграфічны і крыніцазнаўчы аналіз. Найбольш каштоўнымі для мэты даследавання з'яўляюцца архіўныя справы з фондаў "Канцелярии Минского гражданского губернатора" (Ф. 295), "Канцелярии Витебского гражданского губернатора" (Ф. 1430), "Канцелярии Могилевского гражданского губернатора" (Ф. 2001). Акрамя таго, каштоўныя матэрыялы знойдзены сярод спраў фонду 21 "Минский губернский статистический комитет", фонду 2187 "Могилевский губернский статистический комитет" і фонду 2502 "Витебский губернский статистический комитет" Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) у Мінску.

У НГАБ у Гродна матэрыялы пра мануфактурную вытворчасць губерні змешчаны ў фондзе 1 "Канцелярия гродненского губернатора". Прыблізна такая ж інфармацыя знаходзіцца ў асобных справах фонду 14 "Гродненский губернский статистический комитет", а ў фондзе 1007 "Старший фабричный инспектор Гродненской губ." падаецца інфармацыя аб суме паравых катлоў па губерні, скаргі рабочых, дадзеныя аб здарэннях і зафіксаваных парушэннях.

У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы ў Вільнюсе карысную інфармацыю змяшчаюць фонды 378 "Виленский генерал-губернатор" і 388 "Виленский губернский статистический комитет". Сярод фондаў Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Санкт-Пецярбурзе можна вызначыць фонды 17, 18, 869 і 1350. Між тым большасць інфармацыі носіць абагулены характар і дазваляе гаварыць хутчэй пра тэндэнцыі развіцця прамысловасці ў асобных

[15] Полетаева, Н.И. Купечество Беларуси, 60-е гг. XIX – начало XX в. / Н.И. Полетаева. – Минск : Белорус. гос. экон. ун-т, 2004. – 247 с.

[16] Забаўскі, М.М. Буржуазныя рэформы ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. : вучэб.-метад. дапам. / М.М. Забаўскі, А.Ф. Рацько ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 2004. – 64 с.

[17] Пракапович, Л.Э. Становление и развитие фабрично-заводской промышленности в Беларуси в XIX в. : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Л.Э. Пракапович. – Минск, 2006. – 157 л.

губернях Расійскай імперыі, чым прасачыць становішча беларускіх прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу.

Афіцыйная статыстычная інфармацыя пра жыццё беларускіх губерняў прыведзена ў "Всеподданнейших обзорах губерний". Агляды даюць абагуленую тэкставую інфармацыю па розных сферах сацыяльна-эканамічнага жыцця губерняў і падмацоўваюць яе статыстычнымі дадзенымі.

На падставе сабранай інфармацыі Міністэрствам фінансаў было выдадзена некалькі даведнікаў, дзе змешчаны поўныя даныя аб прамысловых адзінках па розных губернях Расійскай імперыі і Царства Польскага за пэўныя гады. Храналагічна першы даведнік "Указатель фабрик и заводов Европейской России и Царства Польского. Материалы для фабрично-заводской статистики" быў выдадзены ў 1881 г., а потым перавыдадзены ў 1887 і 1894 гг. Лагічным працягам стала выданне ў 1897 г. даведніка "Перечень фабрик и заводов. Фабрично-заводская промышленность России". Дадзеныя ў ім прадстаўлены за 1895 г. "Список фабрик и заводов России (по официальным данным фабричного, податного и горного надзора)" таксама выдаваўся тройчы – у 1903, 1910 і 1912 гг. – і з'яўляўся неабходным працягам папярэдніх "Указальнікаў" і "Пераліку".

Аснову даследавання складаюць метады і прынцыпы сучаснага навуковага пазнання. Так, аўтар зыходзіў з прынцыпаў гістарызму і аб'ектыўнасці, а таксама прынцыпу каштоўнаснага падыходу. Падчас правядзення даследавання практычным інструментарыем служылі як агульнанавуковыя метады сінтэзу і аналізу, індукцыі і дэдукцыі, сістэмна-структурнага аналізу, што выкарыстоўваліся комплексна ў прымяненні да збору, апрацоўкі і апісання атрыманых даных, так і ўласна гістарычныя метады: гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-генетычны.

У другой главе "Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы развіцця мануфактурнай вытворчасці ў другой палове XIX – пачатку XX ст." разглядаюцца тыя фактары, што прама ці ўскосна паўплывалі на тагачасную мануфактурную вытворчасць, стымулявалі яе развіццё ці, наадварот, кансервавалі феадальныя перажыткі і эканамічную адсталасць Беларусі.

Палітыка царскага ўрада ў Беларусі прама ці ўскосна аказвала негатыўны ўплыў на развіццё буйной прамысловасці гэтага рэгіёна. У палітычнай сферы жыцця абмежаванне буржуазных рэформаў 1860–1870-х гг., рэжым выключных законаў стрымлівалі станаўленне капіталізму, што адмоўна адбілася на развіцці буйной капіталістычнай прамысловасці. У эканамічнай сферы жыцця меры, накіраваныя на ўмацненне "рускага" дваранскага землеўладання, а таксама абмежаванні гаспадарчай дзейнасці землеўладальнікаў каталіцкага веравызнання, недаступнасць крэдытных рэсурсаў замаруджвалі развіццё перапрацоўчай прамысловасці.



Невысокая прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі не заўсёды дазваляла забяспечыць патрэбы насельніцтва, колькасны склад якога хутка павялічваўся (рост у 2,7 раза). Павелічэнне спажывання і адсутнасць лішкаў сельскагаспадарчай прадукцыі не спрыялі пашырэнню перапрацоўкі, а таму тармазілі развіццё харчасмакавай, вінакурнай, цукраварнай і іншых галін буйной прамысловасці.

Вялікая колькасць рамесных майстэрань і дробнатаварных прадпрыемстваў, з аднаго боку, і нізкі ўзровень развіцця буйной прамысловасці, з другога, былі абумоўлены аб'ектыўнымі сацыяльна-эканамічнымі фактарамі: вялікай колькасцю беспрацоўных, адсутнасцю дастатковай колькасці фінансавых сродкаў у буржуазіі і вузкасцю мясцовага рынку. Мануфактуры і фабрыкі канкурыравалі з дробнымі прадпрыемствамі і рамесніцкімі майстэрнямі, што звычайна выраблялі больш танную прадукцыю, хоць і горшай якасці. Таму на працягу ўсяго даследуемага перыяду мануфактуры і фабрычна-заводскія прадпрыемствы вымушаны былі дзяліць унутраны рынак з дробнымі вытворчымі адзінкамі.

Для беларускай мануфактурнай вытворчасці пераваг ад паляпшэння шляхоў зносін і будаўніцтва чыгуначнай сеткі было некалькі. Па-першае, развіццё шляхоў зносін стымулявала працэс канцэнтрацыі вытворчасці. Па-другое, павышала канкурэнтаздольнасць прадукцыі. Па-трэцяе, надала імпульс развіццю лесахімічнай і дрэваапрацоўчай галін мануфактурнай вытворчасці. Па-чацвёртае, чыгунка сама з'яўлялася спажыўцом вялікай колькасці лесу на шпалы і цэглы на будаўніцтва дэпо, станцый і іншых пабудоў.

Фінансава-крэдытная сістэма Беларусі абслугоўвала ў большасці сельскагаспадарчыя праграмы, правядзенне якіх адпавядала інтарэсам цэнтральнай улады. Крэдытаваннем прамысловасці займаліся пераважна прыватныя акцыянерныя банкі, што прапаноўвалі горшыя ўмовы крэдытавання.

Гарады і гарадскія прадмесці, а таксама асобныя мястэчкі з'яўляліся прывабнымі пляцоўкамі для развіцця прамысловасці і стварэння буйных прамысловых прадпрыемстваў.

Пералічаныя фактары прадвызначылі заняпад вотчыннай мануфактуры ў першае парэформеннае дзесяцігоддзе і хуткае развіццё капіталістычных прадпрыемстваў гэтага тыпу ў канцы XIX – пачатку XX ст., якое пераважала ў гарадах і праходзіла ў жорсткай канкурэнцыі з дробнымі вытворчымі адзінкамі.

Трэцяя глава "Мануфактурная вытворчасць Беларусі ў 1861–1914 гг." знаёміць з сабранымі падчас даследавання данымі, з якіх вынікае, што беларуская мануфактурная вытворчасць у 1861–1914 гг. была прадстаўлена даволі сціпла. У азначаны перыяд існавала ўсяго 763 прадпрыемствы мануфактурнага тыпу, а сумарная колькасць рабочых за ўвесь перыяд склала толькі 37 247 чалавек. Трэба заўважыць, што прыведзеныя паказчыкі – гэта

сумарная колькасць мануфактур, якія ніколі не працавалі адначасова. Тое ж можна сказаць і пра паказчык колькасці рабочых, якія былі заняты на гэтых прадпрыемствах. Відавочна, што мануфактуры ні ў адным годзе з даследуемага перыяду не мелі нават паловы ад сумарнай колькасці рабочых.

З іншага боку, можна прасачыць дынаміку развіцця мануфактурнай вытворчасці ў 1861–1914 гг. Павелічэнне колькасці мануфактур, занятых на іх рабочых і сумы вытворчасці ў 1896–1913 гг. у параўнанні з 1861–1879 гг. сведчыць пра станоўчую дынаміку развіцця, колькасны і якасны рост мануфактуры. Нават у параўнанні з фабрычна-заводскай вытворчасцю мануфактура доўгі час мела перавагу па колькасці прадпрыемстваў і рабочых, прыблізна роўныя паказчыкі па канцэнтрацыі рабочых і сярэднім памеры прадпрыемстваў, прайграючы толькі па суме вытворчасці.

Асноўная колькасць прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу знаходзілася ў гарадах, але вялікая частка працавала і ў сельскай мясцовасці. Даволі слаба была прадстаўлена мануфактура ў мястэчках. Перавага першых тлумачыцца наяўнасцю ў гарадах фінансава-крэдытных устаноў, а таксама больш шырокімі магчымасцямі для рэалізацыі прадукцыі. Перавагі, што атрымлівалі сельскія мануфактуры, – гэта мясцовая сыравіна і танная рабочая сіла, якая мелася тут у неабходнай колькасці.

Асноўнымі галінамі мануфактурнай вытворчасці з'яўляліся апрацоўка валакністых рэчываў, мінеральных выкапняў, а таксама лесахімія і дрэваапрацоўка, адносна добра развіваліся шкляныя і тытунёвыя мануфактуры. А вось харчасмакавых і вінакурных мануфактур было няшмат. Асноўная частка гэтай прадукцыі выраблялася дробнатаварнымі прадпрыемствамі ці фабрычна-заводскай прамысловасцю.

Лідэрамі сярод беларускіх губерняў па колькасці прадпрыемстваў з'яўляліся Магілёўская і Мінская, а па колькасці рабочых пераважала Гродзенская губерня. Нізкі ўзровень развіцця мануфактурнай вытворчасці прадэманстравалі беларускія паветы Віцебскай і Віленскай губерняў.

Такім чынам, мануфактурная вытворчасць не вызначалася вялікай колькасцю прадпрыемстваў, рабочых і сумай вытворчасці ў даследуемы перыяд. У эканоміцы краю пераважала сельская гаспадарка, што мела патрэбу ў перапрацоўцы часткі сваёй прадукцыі, а яшчэ – прыладах працы і будаўнічых матэрыялах. Тым не менш, мануфактура з'яўлялася важкай састаўной часткай буйной прамысловасці і выконвала пэўныя функцыі.

У чацвёртай главе "Уплыў мануфактуры на сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст." вызначана месца беларускай прамысловасці ў агульнарасійскім кантэксце, пазіцыі якой нават у пачатку XX ст. заставаліся вельмі сціплымі. Але ў той жа час высокія паказчыкі



росту прамысловасці, у тым ліку мануфактурнай, вызначылі станоўчую дынаміку развіцця эканомікі Беларусі.

Акрамя значнай ролі ў дынамічным развіцці прамысловасці, асноўныя аспекты ўплыву мануфактурнай вытворчасці можна падзяліць на сацыяльныя, эканамічныя і тэхнічныя. Да **сацыяльных** аспектаў можна аднесці наступныя: станоўчы ўплыў мануфактуры на фарміраванне і развіццё рынку вольнанаёмнай працы, стымуляванне працэсаў урбанізацыі, а таксама развіцця беларускіх гарадоў як прамысловых і эканамічных цэнтраў. Развіццё капіталістычнай мануфактуры спрыяла фарміраванню і павелічэнню праслойкі прафесійных рабочых – пралетарыяту, а таксама праслойкі прамысловай буржуазіі.

Што да **эканамічных** аспектаў жыцця грамадства, то мануфактурная вытворчасць стварала попыт і стымулявала вытворчасць такіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі, як зерне, бульба, лён, мяса, скура і г. д. Неабходна адзначыць станоўчую ролю мануфактуры ў капіталізацыі эканомікі: развіцці таварна-грашовых адносін, гандлю, павелічэнні спажывання і грузазвароту. У рэшце рэшт, мануфактура з'яўлялася важным састаўным элементам прамысловасці парэформеннага краю і часткова кампенсавала нізкі ўзровень развіцця фабрычна-заводскай вытворчасці.

Што тычыцца ролі мануфактуры ў **тэхнічным** развіцці Беларусі, то, магчыма, яе перавагі ў асобных галінах прамысловасці негатыўна адбіваліся на эканоміцы краю, марудзячы развіццё фабрычна-заводскай вытворчасці. Апошняя, з'яўляючыся тэхнічна больш дасканалай, не заўсёды магла рэалізаваць свой патэнцыял з-за наяўнасці вялікай колькасці таннай працоўнай сілы і недахопу крэдытных рэсурсаў на закуп сучаснага абсталявання, што давала перавагу мануфактуры.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1. Прадстаўнікі дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі амаль што не звярталі ўвагі на рэгіянальную спецыфіку мануфактурнай вытворчасці Беларусі (М.І. Туган-Бараноўскі, Дз.А. Цімiразеў) ці наогул не акрэслівалі межаў Беларусі, а проста аналізавалі вытворчасць асобных губерняў (А.В. Пагожаў, А.С. Дзембавіцкі) ці груп губерняў (П.П. Сямёнаў). Нявырашанымі заставаліся пытанні азначэння мануфактуры і методыкі падліку.

Для савецкай гістарыяграфіі характэрна памкненне да перабольшвання ўзроўню развіцця буйной прамысловасці, у тым ліку і мануфактурнай (М.Ф. Болбас, З.Е. Абезгаўз), яе ўплыву на сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы ў грамадстве (М.В. Доўнар-Запольскі, Д.А. Дудкоў). Архіўныя даныя, а таксама інфармацыйныя даведнікі сведчаць пра тое, што ў савецкі перыяд штучна завышалася колькасць буйных прамысловых прадпрыемстваў, а сумарныя паказчыкі за некалькі дзесяцігоддзяў падаваліся нібыта за адзін, часцей за ўсё апошні, год з даследуемага перыяду, пэўную ролю ў павелічэнні паказчыкаў буйной прамысловасці адыгралі аўтарскія выключэнні і дапушчэнні (М.Ф. Болбас).

Сучасныя айчынныя гісторыкі асобна не разглядалі мануфактурную вытворчасць парэформеннай Беларусі, тым не менш дэталёва вывучаліся сумежныя пытанні жыцця дваранства (А.П. Жытко), купецтва (Н.І. Палятаева), ролі гарадоў (З.В. Шыбека), сельскай гаспадаркі (М.М. Забаўскі і А.Ф. Рацько), фабрычна-заводскай вытворчасці (Л.Э. Пракаповіч). Абагульняючая праца апісвае сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі, на жаль, толькі за дарэформенны перыяд (А.М. Люты).

Вынікі даследавання мануфактурнай вытворчасці ў значнай меры залежаць ад вызначэння межаў даследавання і дэфініцый асноўных катэгорый, якімі карыстаецца даследчык. Так, колькасць мануфактур, знойдзеных на адной геаграфічнай тэрыторыі ў адзін і той жа прамежак часу, можа змяняцца ў залежнасці ад таго, якая колькасць рабочых вызначаецца як мінімальная для прадпрыемстваў гэтага тыпу вытворчасці. Наогул, адмена мінімальнай мяжы колькасці рабочых можа значна павялічыць колькасць “мануфактур”, дазволіўшы аднесці да гэтай групы і дробнатаварныя прадпрыемствы без паравога рухавіка. Тое ж можна сказаць і пра вызначэнне геаграфічных межаў Беларусі ў 1861–1914 гг., улічваючы іх несупадзенне з сучасным адміністратыўна-тэрытарыяльным падзелам краіны. Таму недакладнае вызначэнне геаграфіі даследавання дазваляе ўключыць ці выключыць асобныя прадпрыемствы, тым самым штучна паляпшаючы ці пагаршаючы паказчыкі.

Выкарыстанне новых інфармацыйных крыніц, а таксама методыка апрацоўкі даных дазволілі сабраць і аб’ектыўна ацаніць узровень развіцця мануфактурнай вытворчасці Беларусі ў 1861–1914 гг., параўнаць уласныя вынікі з данымі, што прыводзяцца іншымі даследчыкамі [1; 5].

2. Затрымка ў ажыццяўленні ці скасаванне рэформаў 60–70-х гг. XIX ст. у беларускіх губернях прадвызначылі невысокія тэмпы развіцця буйной прамысловасці, як і ўсёй беларускай эканомікі, у парэформенны перыяд. Адмоўным чынам на эканоміку краю паўплывала палітыка насаджэння буйнога расійскага землеўладання, што стрымлівала развіццё капіталізму ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Забарона куплі-продажу зямлі для



памешчыкаў каталіцкага веравызнання адмоўна адбілася на развіцці перапрацоўчых прадпрыемстваў. Падзел насельніцтва па сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай прыкмеце, па мове змяншаў магчымасці для сацыяльнай мабільнасці, што адмоўна паўплывала на станаўленне рынку наёмнай працы і індустрыялізацыю гаспадаркі, асабліва ў першыя парэформенныя дзесяцігоддзі.

Наяўнасць мяжы яўрэйскай аселасці, іншыя абмежаванні для прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці, а менавіта забарона на валоданне зямлёй і больш высокія падаткі, змяншалі магчымасці для назапашвання капіталаў купцамі-яўрэямі, вынікам чаго стала вялікая колькасць дробнатаварных прадпрыемстваў і рамесных майстэрань, што канкуравалі з буйной прамысловасцю на вузкім мясцовым рынку.

Адмена прыгоннага права, буржуазныя рэформы 1860–1870-х гг. і асабліва сталыпінская аграрная рэформа павялічылі таварнасць сельскай гаспадаркі і ўзмацнілі яе ўплыў на эканоміку краю, што палепшыла ўмовы для развіцця буйной капіталістычнай прамысловасці. Аднак танная рабочая сіла беззямельных сялян і адсутнасць фінансавых сродкаў у землеўладальнікаў не спрыялі павышэнню тэхнічнай аснашчанасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Таму адсталасць памешчыцкай гаспадаркі ў парэформенныя дзесяцігоддзі абумовіла нізкія паказчыкі ўрадлівасці глебы і, як вынік, не магла цалкам забяспечыць перапрацоўчыя мануфактуры дастатковай колькасцю сыравіны.

Будаўніцтва чыгунак і паляпшэнне шляхоў зносін надалі імпульс развіццю мануфактурнай вытворчасці Беларусі. Чыгуначная сувязь з цэнтральнарасійскімі губернямі павялічвала магчымасці збыту прадукцыі і паставак сыравіны, зніжала кошт перавозак і выдаткі часу, а таму рабіла беларускую прадукцыю канкурэнтаздольнай за межамі краю. Так, паляпшэнне інфраструктуры выклікала развіццё лесахімічнай і дрэваапрацоўчай галін мануфактурнай вытворчасці.

На жаль, будоўля чыгунак і паляпшэнне шляхоў зносін перш за ўсё адпавядалі стратэгічным інтарэсам цэнтральнай улады царскай Расіі і дыктаваліся ваенна-абарончымі патрэбамі. Таму рэгіянальныя асаблівасці і эканамічная мэтазгоднасць не заўсёды ўлічваліся.

Позняе з’яўленне і развіццё фінансава-банкаўскай сістэмы Беларусі збольшага адпавядала патрэбам сельскагаспадарчых вытворцаў. Крэдытаванне буйных прамыслоўцаў ажыццяўлялася камерцыйнымі банкамі на кароткі тэрмін і пад высокі працэнт.

Індыкатарам павышэння значнасці гарадоў стала хуткае павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва, што з 1861 па 1913 г. вырасла больш чым у тры разы – з 320 да 980 тыс. чалавек. Выключную эканамічную ролю набылі

губернскія гарады, а таксама Брэст, Гомель, Бабруйск і Пінск. Гэтыя і іншыя гарады станавіліся фінансава-крэдытнымі, гандлёвымі і прамысловымі цэнтрамі Беларусі. У гарадах знаходзілася 52 % прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу, што выраблялі прадукцыі амаль на 14 млн руб. Тут таксама працавала больш за палову ўсіх рабочых мануфактур, сярод якіх пераважалі яўрэі, што былі гвалтоўна перасеЛены ў Беларусь з цэнтральнарасійскіх губерняў. Вялікая колькасць яўрэяў-гараджан і невысокі ўзровень развіцця прамысловасці часткова стрымлівалі прыток у гарады вольнанаёмнай рабочай сілы з сельскай мясцовасці.

Павелічэнне агульнай колькасці насельніцтва Беларусі да 1914 г. амаль у 2,7 раза ў параўнанні з 1861 г. выклікала з'яўленне вялікай колькасці выхадцаў з сялянскага асяроддзя, што засталіся без працы і вымушаны былі шукаць заробак у прамысловасці, а ўлічваючы невысокі ўзровень развіцця апошняй – займаліся рамёствамі. Вялікая колькасць рамесных майстэрань у канцы XIX – пачатку XX ст. стрымлівала развіццё буйных прадпрыемстваў. З другога боку, наяўнасць таннай рабочай сілы дазваляла прадпрыемствам мануфактурнага тыпу да канца даследуемага перыяду канкурыраваць з фабрычна-заводскай вытворчасцю [3].

3. Парэформенная мануфактура прайшла тры этапы ў сваім развіцці: 1860–1870-я, 1880–1890-я і пачатак XX ст. да Першай сусветнай вайны. Захаванне феадальных перажыткаў пасля адмены прыгону не дазволіла ажыццявіць хуткую індустрыялізацыю гаспадаркі, наадварот – два парэформенныя дзесяцігоддзі характарызуюцца застоем і нізкімі паказчыкамі мануфактурнай вытворчасці. За першыя два парэформенныя дзесяцігоддзі было знойдзена толькі 78 мануфактур з 4983 рабочымі і сумай вытворчасці ў 2125 тыс. руб.

Калі для першага этапу быў характэрны дарэформенны ўзровень развіцця мануфактурнай вытворчасці, то ў 1880-я гг. пачынаецца шматразовае павелічэнне колькасці прадпрыемстваў, рабочых і аб'ёму вытворчасці. У перыяд з 1880 па 1895 г. было зафіксавана 296 мануфактур з 12 636 рабочымі і сумай вытворчасці ў 6,8 млн руб., што ў 3–4 разы пераўзыходзіла паказчыкі першага перыяду па колькасці прадпрыемстваў і больш чым у 2–3 разы па колькасці рабочых і суме вытворчасці.

Тая ж тэндэнцыя назіраецца і ў пачатку XX ст., толькі працэнтны рост асноўных паказчыкаў выглядае больш сціпла. Аднак натуральны прырост не змяншаецца, таму колькасць мануфактур у 1896–1914 гг. дасягнула 424 адзінак. А сума вытворчасці павялічылася да 18 463 тыс. руб. Што тычыцца колькасці рабочых, трэба заўважыць і тое, што рост больш чым у чатыры разы гэтага паказчыка на аналізуемых прадпрыемствах – з 4983 чалавек у 1861–1879 гг. да



21634 у 1895–1913 гг. – выглядае даволі сціпла, калі ўлічваць амаль трохразовае павелічэнне агульнай колькасці насельніцтва Беларусі за 1863–1913 гг.

У структуры мануфактурнай вытворчасці Беларусі па колькасці прадпрыемстваў пераважалі галіны па апрацоўцы мінеральных выкапняў (113), лесахімічная і дрэваапрацоўчая (97) і гарбарная (92). Найболей рабочых было занята ў адзначаных галінах мануфактурнай вытворчасці, а таксама ў апрацоўцы валакністых рэчываў (5016), на шкляных (4469) і папяровых (4087) прадпрыемствах.

Большасць уладальнікаў мануфактурных прадпрыемстваў у гарадах і мястэчках па сацыяльным статусе былі купцамі ці багатымі мяшчанамі, а працавалі на іх бедныя гараджане. У сельскай мясцовасці мануфактуры належалі землеўладальнікам, а працавалі на іх вольнанаёмныя рабочыя, што ў пераважнай большасці былі збяднелымі ці беззямельнымі сялянамі.

Па нацыянальным складзе большасць уладальнікаў і рабочых мануфактурных прадпрыемстваў у гарадах і мястэчках была яўрэйскай нацыянальнасці. У сельскай мясцовасці выключная большасць рабочых былі беларусамі, і ўладальнікамі былі ў асноўным беларусы; таксама сустракаліся палякі і рускія.

Што тычыцца геаграфічнага размеркавання, то па колькасці мануфактур вызначаліся Магілёўская і Мінская губерні, што мелі 218 і 212 прадпрыемстваў адпаведна, але па колькасці рабочых пераўзыходзілі мануфактуры беларускіх паветаў Гродзенскай губерні, на якіх працавала 11 472 чалавекі. Сціплыя паказчыкі беларускіх паветаў Віцебскай і Віленскай губерняў тлумачацца іх меншымі памерамі і меншай колькасцю насельнітва [6; 7].

4. Нягледзячы на шматразовае павелічэнне колькасці буйных прадпрыемстваў і змены ў структуры прамысловасці на працягу даследуемага перыяду, рамесная і дробнатаварная вытворчасці таксама вызначаліся ростам па ўсіх асноўных паказчыках. Таму ў пачатку XX ст. яны ўсё яшчэ пераўзыходзілі і мануфактурную, і буйную прамысловасць цалкам. Так, з 1860 г. і да канца XIX ст. колькасць рамесных майстэрань павялічылася з 12 тыс. да 95 тыс., а майстроў, іх вучняў і рабочых – з 23 тыс. да 170 тыс. чалавек, сума вытворчасці таксама ўзрасла з 4,3 да 14,1 млн руб. Паступовае развіццё было характэрна і для дробнатаварных прадпрыемстваў. Іх колькасць павялічылася з некалькіх соцень да 1125, а колькасць рабочых – з 2,2 тыс. да 8,5 тыс. чалавек. Сума вытворчасці наогул патроілася і дасягнула 26 млн руб.

Акрамя ізноў створаных фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў і ператварэння дробнатаварных майстэрань, аснашчаных паравымі рухавікамі ці катламі, у фабрыкі ды заводы за кошт павелічэння колькасці рабочых, некаторыя прадпрыемствы мануфактурнага тыпу ў канцы даследуемага перыяду таксама абсталёўваліся паравымі катламі ці рухавікамі. Аднак гэта

з'ява не набыла значнага маштабу, а мануфактурная вытворчасць нават напрыканцы XIX ст. па многіх паказчыках не прайгравала фабрычна-заводскай прамысловасці.

Па паказчыку колькасці прадпрыемстваў і рабочых у першыя парэформенныя дзесяцігоддзі пераважала капіталістычная мануфактура, у апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. мануфактура і фабрыка мелі ўжо роўныя паказчыкі. Па суме ж вытворчасці з-за вышэйшай прадукцыйнасці працы фабрыкі і заводы пераўзыходзілі мануфактуру на працягу ўсяго даследаванага перыяду. У пачатку XX ст. фабрычна-заводская вытворчасць пераважала па ўсіх асноўных паказчыках. Сярэдняя колькасць рабочых на прадпрыемствах як мануфактурнага, так і фабрычна-заводскага тыпу была прыблізна роўнай і складала каля 50 рабочых на адным прадпрыемстве.

Акрамя адрозненняў у галіновым размеркаванні прадпрыемстваў мануфактурнага і фабрычна-заводскага тыпаў адзначана, што ў гарадах размяшчалася асноўная частка мануфактур, а ў сельскай мясцовасці – фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў. Адносна колькасці рабочых можна сцвярджаць, што на гарадскіх фабрычна-заводскіх прадпрыемствах іх працавала значна больш, чым на сельскіх. Што да мануфактур, то сярэдняя колькасць рабочых на сельскіх прадпрыемствах значна перавышала іх сярэднюю колькасць на гарадскіх мануфактурах, але агульная колькасць гарадскіх рабочых была большай.

Падабенства паміж абодвума тыпамі буйной прамысловасці назіраецца ў храналогіі этапаў развіцця: дарэформенны ўзровень у 60–70-я гг. XIX ст., выбуховы рост у 80–90-я гг. XIX ст. і захаванне станоўчай дынамікі ў пачатку XX ст. [4].

5. Узровень развіцця буйной індустрыі з'яўляецца добрым індыкатарам сталасці капіталістычных адносін. Хуткі рост мануфактурнай і фабрычна-заводскай прамысловасці ў канцы XIX – пачатку XX ст. быў прыкметай позняга станаўлення новай для Беларусі сацыяльна-эканамічнай фармацыі. Але па ўзроўні развіцця буйной прамысловасці беларускія губерні відавочна прайгравалі нават прамыслова развітым рэгіёнам Расіі, ужо не кажучы пра развітыя заходнееўрапейскія краіны.

Невялікая колькасць мануфактур, іх адносна малыя памеры пры нязначнай агульнай колькасці рабочых, якая складала менш за 0,01 працэнта ў агульным складзе насельніцтва нават напрыканцы даследуемага перыяду, не даюць падстаў гаварыць пра рашучы ўплыў капіталістычнай мануфактуры на сацыяльна-эканамічныя працэсы жыцця грамадства. Тым не менш у агульнай структуры вытворчасці мануфактуры адводзілася значная роля, а паказчыкі росту колькасці прадпрыемстваў у 5,5 раза, рабочых – у 4,3 раза і сумы вытворчасці – у 8,7 раза вызначалі дынаміку развіцця прамысловасці.



Капіталістычная мануфактура адыграла значную ролю ў фарміраванні рынку вольнанаёмнай працы, а таксама выхаванні пралетарыяту буйной беларускай прамысловасці, колькасць якога ў параўнанні з першымі парэформеннымі дзесяцігоддзямі павялічылася ў чатыры разы. Павелічэнне колькасці прадпрыемстваў мела вынікам не толькі фарміраванне пралетарыяту, але і з'яўленне прамысловай буржуазіі. Да канца даследуемага перыяду колькасць мануфактур, што знаходзіліся ва ўласнасці дваран, паменшылася да 11 адзінак, а колькасць тых, што належалі купцам і мяшчанам, наадварот, узрасла да 93 прадпрыемстваў, што склала 78 працэнтаў ад усёй колькасці мануфактур, якія працавалі ў 1909 г.

Капіталістычная мануфактура адыгрывала значную ролю ў развіцці таварна-грашовых адносін, станаўленні гарадоў як прамысловых цэнтраў, фарміраванні рынкаў працы, спажывецкіх тавараў і сыравіны, з'яўляючыся як вытворцам, так і спажыўцом сыравіны, паліва і працоўных рэсурсаў. Патрэба ў сельскагаспадарчай прадукцыі для перапрацоўкі стымулявала сельскагаспадарчыя прадпрыемствы да павелічэння аб'ёмаў вытворчасці і выхаду са сваёй прадукцыяй на рынак.

У Беларусі мануфактура з'ўлялася не толькі прамежкавай ступенню паміж рамяством і фабрычна-заводскай вытворчасцю, але і часткова кампенсавала нізкі ўзровень развіцця буйной машыннай індустрыі. Менавіта таму ў Беларусі храналогія развіцця парэформенных мануфактуры і фабрыкі супадае. Гэта тлумачыцца тым, што з-за недахопу сродкаў у мясцовай буржуазіі і ігнаравання царскім урадам асаблівасцяў рэгіянальнага развіцця, а таксама наяўнасці таннай рабочай сілы ў Беларусі на працягу ўсяго даследуемага перыяду на роўных з фабрыкай існавала і паспяхова развівалася мануфактурная вытворчасць.

Тыя ж фактары – недахоп сродкаў і наяўнасць таннай рабочай сілы – не дазвалялі машыннай індустрыі выціснуць прадпрыемствы, заснаваныя на выкарыстанні ручной працы, сярод якіх мануфактура была самай дасканалай. Таму мануфактура на працягу даследуемага перыяду не толькі дапаўняла, але і канкурыравала з тэхнічна больш дасканалымі фабрыкамі і заводамі, што безумоўна марудзіла іх развіццё і павышала канкурэнцыю на мясцовым рынку [2].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Вынікі даследавання могуць дапамагчы ў распрацоўцы новых канцэптуальных падыходаў да вывучэння і асэнсавання працэсаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Матэрыялы і высновы даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац, падручнікаў, навукова-метадычных дапаможнікаў, а таксама для падрыхтоўкі агульных і спецыяльных курсаў па айчыннай гісторыі, у прыватнасці, па гісторыі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў 1861–1914 гг.

# СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


**Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках**

1. Башмакоў, А.А. Гістарыяграфія гісторыі мануфактурнай вытворчасці ў Беларусі ў 1861—1900 гг. / А.А. Башмакоў // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія, Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2007. – № 1. – С. 18–22.

2. Башмакоў, А.А. Параўнальны аналіз развіцця мануфактурнай і фабрычна-заводскай вытворчасці ў Беларусі (1861–1914 гг.) / А.А. Башмакоў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 11. – С. 11–17.

3. Башмакоў, А.А. Мануфактурная вытворчасць Беларусі ў 1861–1914 гг.: умовы развіцця / А.А. Башмакоў // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія, Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2008. – № 4. – С. 10–14.

4. Башмакоў, А.А. Развіццё мануфактурнага і фабрычна-заводскага тыпаў буйной прамысловасці Беларусі ў 1861–1914 гг. / А.А. Башмакоў // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2008. – № 4. – С. 43–46.

**Матэрыялы канферэнцый**

5. Башмакоў, А.А. Мануфактурная вытворчасць Беларусі ў другой палове XIX ст. / А.А. Башмакоў // Беларусь у эпоху рэвалюцыйных узрушэнняў : да 100-годдзя выхаду ў свет газеты "Наша ніва": матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 10 лістап. 2006 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал. І.І. Багдановіч [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 75–79.

6. Башмакоў, А.А. Мануфактурна-фабрычная вытворчасць Беларусі ў 60–70-я гады XIX ст. / А.А. Башмакоў // Актуальныя праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) : да 90-годдзя Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 23 лют. 2007 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал. А. І. Андарала [і інш.]. – Мінск, 2007. – С. 205–207.

7. Башмакоў, А.А. Тэндэнцыі развіцця мануфактурна-фабрычнай прамысловасці Беларусі ў 1880–1895 гадах / А.А. Башмакоў // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : материалы Междунар. науч.-теоретич. конф., Минск, 25 апр. 2008 г. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: В.В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2008. – С. 252–254.




# РЭЗЮМЭ


Башмакоў Аляксей Аляксеевіч

**Мануфактурная вытворчасць і яе роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі. 1861–1914 гг.**

**Ключавыя словы:** мануфактура, фабрычна-заводская прамысловасць, дробнатаварная вытворчасць, рамяство, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы, капіталізм, сума вытворчасці, вытворчая адзінка.

**Аб'ект даследавання:** прамысловасць Беларусі ў 1861–1914 гг.

**Прадмет даследавання:** капіталістычная мануфактура і яе роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.

**Мэта даследавання** – вызначыць ролю і месца мануфактурнай вытворчасці ў сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі ў 1861–1914 гг.

**Метады даследавання.** Для вырашэння пастаўленых задач аўтар зыходзіў з прынцыпаў аб'ектыўнасці, гістарызму, а таксама каштоўнаснага прынцыпу. Падчас правядзення даследавання практычным інструментарыем служылі як агульнанавуковыя метады сінтэзу і аналізу, індукцыі і дэдукцыі, сістэмна-структурнага аналізу і кантэнт-аналізу, так і ўласна гістарычныя метады: гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-генетычны.

**Навуковая навізна.** Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі, абапіраючыся на комплексны аналіз навуковай літаратуры і рэпрэзентатыўных крыніц, а таксама сучасныя метады даследавання, была не толькі прааналізавана мануфактура, але і вызначана яе роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ў 1861–1914 гг.

Праца таксама вызначаецца тым, што ў ёй упершыню адлюстраваны не толькі станоўчыя, але і адмоўны аспект уплыву мануфактурнай вытворчасці на тэхнічнае развіццё краю. Акрамя таго, даследаванне ўводзіць у навуковы зварот шырокае кола архіўных крыніц і дакументаў.

**Практычнае значэнне** заключаецца ў раскрыцці ролі і месца мануфактурнай вытворчасці, а таксама ўзроўню развіцця сацыяльна-эканамічных працэсаў у краі. Матэрыялы дысертацыі і высновы могуць быць выкарыстаны пры напісанні навуковых прац, падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, пры падрыхтоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гісторыі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст.

## РЕЗЮМЕ

Башмаков Алексей Алексеевич

**Мануфактурное производство и его роль в социально-экономическом развитии Беларуси. 1861–1914 гг.**

**Ключевые слова:** мануфактура, фабрично-заводская промышленность, мелкотоварное производство, ремесло, социально-экономические и политические условия, капитализм, сумма производства, производственная единица.

**Объект исследования:** промышленность Беларуси в 1861–1914 гг.

**Предмет исследования:** капиталистическая мануфактура и ее роль в социально-экономическом развитии Беларуси второй половины XIX – начала XX в.

**Цель исследования** – определить роль и место мануфактурного производства в социально-экономической жизни Беларуси в 1861–1914 гг.

**Методы исследования.** Для решения поставленных задач автор исходил из принципов объективности, историзма, а также ценностного принципа. Во время проведения исследования практическим инструментарием служили как общенаучные методы синтеза и анализа, индукции и дедукции, системно-структурного анализа и контент-анализа, так и собственно исторические методы: историко-типологический, историко-сравнительный, историко-системный и историко-генетический.

**Научная новизна.** Впервые в белорусской историографии, опираясь на комплексный анализ научной литературы и репрезентативных источников, а также современные методы исследования, была не только проанализирована мануфактура, но и выявлена её роль в социально-экономическом развитии Беларуси в 1861–1914 гг.

Работа также отличается тем, что в ней впервые отражены не только положительные, но и отрицательный аспект влияния мануфактурного производства на техническое развитие края. Кроме того, исследование вводит в научный оборот широкий круг архивных источников и документов.

**Практическое значение** заключается в раскрытии роли и места мануфактурного производства, а также уровня развития социально-экономических процессов в крае. Материалы диссертации и выводы могут быть использованы при написании научных работ, учебников и учебно-методических пособий, при подготовке общих и специальных курсов по истории Беларуси конца XIX – начала XX в.



## SUMMARY

Bashmakou Aliaksei Aliakseevich

**Manufactory and Its Role in Socio-Economic Development of Belarus in 1861–1914**

**Key words:** manufactory, large-scale machine industry, small-scale industry, handicraft, socio-economic and political factors, capitalism, total production, production unit.

**Object of the research:** Belarusian industry in 1861–1914.

**Unit of the analysis:** capitalistic manufactory and its role in socio-economic development of Belarus in the second half of XIX c. – the beginning of XX c.

**Goal of the research** is to define the role and the place of manufactory in socio-economic life of Belarus in 1861–1914.

**Research methods.** To cover the research questions the author followed the principles of objectivity, historism and value principle. The practical toolbox of the research included general scientific methods of synthesis and analysis, induction and deduction, system-and-structure analysis and content-analysis, as well as specific historical methods: historical-typological, historical-comparative, historical-systemic and historical-genetic.

**Scientific novelty.** For the first time in Belarusian historiography based on complex analysis of scientific literature, representative sources and modern research methods not only the analysis of manufactory but also its role in socio-economic development of Belarus in 1861–1914 was carried out.

The paper is also notable for reflection of not only positive but also negative aspects of manufactory's influence on the technical development of the region. Furthermore, the research introduced a large number of archive sources and documents into scientific circulation.

**Practical importance** of the research lies in the analysis of the role and the place of manufactory, as well as the level of socio-economic development of the region. The materials of the thesis and its findings can be used for writing of scientific papers, textbooks and handbooks, preparation of general and specific courses on Belarusian history at the end of XIX c. – beginning of XX c.



Падпісана ў друк 16.09.09. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 1.4 . Тыраж 60 экз. Заказ 377 .

*Паліграфічнае выкананне:* Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».
ЛП № 02330/0494171 от 03.04.09. 220050, Мінск, Савецкая, 18.

*Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка* ў Вучэбна-выдавецкім цэнтры БДПУ.
220007, Мінск, Магілёўская, 37.